■ Напярэдадні падзеі

# ІНВЕСТЫЦЫІ, ЗАНЯТАСЦЬ, ЭКСПАРТ



## На Гродзеншчыне зроблена шмат, але патэнцыял значна большы

**Напярэдадні V Усебеларускага народнага сходу дэлегаты ад Гродзеншчыны (іх выбрана 350 чалавек) сустрэліся, каб абмеркаваць сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёна і ўнесці свае прапановы на разгляд маючага адбыцца форуму.**

— Безумоўна, Гродзеншчыне ёсць чым ганарыцца па выніках прайшоўшай пяцігодкі. Зроблены сур'ёзныя крокі і ў эканамічным развіцці, і ў сацыяльнай сферы. Але патэнцыял рэгіёна значна большы, — адзначыў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ**. — Як яго рэалізаваць, як працаваць у новых эканамічных умовах, якія метады і механізмы, вобразна кажучы, уключаць? Зразумела, у нашых планах павышэнне эфектыўнасці работы эканомікі, той матэрыяльнай базы, якая створана ў тым ліку і за папярэднюю пяцігодку. Якімі метадамі кіравання трэба авалодваць і як прымяняць іх на практыцы — гэтыя пытанні таксама актуальныя. Як і ўдасканальванне дзяржаўнай палітыкі, размежаванне функцый дзяржаўнай і гаспадарчай дзейнасці, стварэнне новых рабочых месцаў, развіццё малога і сярэдняга бізнесу, ажыўленне ініцыятыўнасці дзелавых людзей.

За апошнія гады на Гродзеншчыне актыўна ствараліся новыя вытворчасці і мадэрнізаваліся дзейныя прадпрыемствы. У прыватнасці, на Гродзенскім мясакамбінаце пабудавалі цэх па вытворчасці сыравэнджаных вырабаў, у ААТ «Малочны свет» — цэх па вырабе сычужных сыроў, у Мастоўскім раёне — новы завод па вытворчасці крухмалу, у ААТ «Лідахлебапрадукт» — фабрыку па вытворчасці макаронных вырабаў. У ААТ «Беллакт» стварылі вытворчасць вадкага і пастападобнага дзіцячага харчавання, у ААТ «Карэлічы-Лён» правялі рэканструкцыю з устаноўкай высокапрадукцыйнай лініі доўгага і кароткага валакна, на шклозаводзе «Нёман» арганізавалі вытворчасць шклаваты. Увялі ў эксплуатацыю 62 новыя малочнатаварныя комплексы, рэканструявалі пад сучасныя тэхналогіі 108 малочных фермаў...

Уладзімір Краўцоў падкрэсліў, што самая пільная ўвага ў эканоміцы будзе ў бягучай пяцігодцы ўдзяляцца пытанням інвестыцый, працоўнай занятасці, экспарту. Захаваецца і сацыяльная накіраванасць эканамічнай палітыкі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prokopchik@zviazda.by*

# ДАСЯГНЕННЕ МЭТ У НЯПРОСТЫХ УМОВАХ

**Ад Віцебскай вобласці ў ліку 350 дэлегатаў на V Усебеларускім народным сходзе каля 40% — жанчыны, кожны дзясяты — прадстаўнік моладзі.**

Падчас абласнога сходу дэлегаты абмеркавалі зробленае за 5 гадоў і планы на будучыню.

— Нагадаю, што мінулы Усебеларускі сход праходзіў пад дэвізам «За моцную і квітнеючую Беларусь». Асноўныя праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця за мінулую пяцігодку выкананы. Пры гэтым дасягненне мэт і задач праходзіла ў няпростых умовах, — канстатаваў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСТНЁЎ.**

Губернатар падкрэсліў, што галоўным багаццем нашай краіны былі і застаюцца людзі. І добра, што дэмаграфічная сітуацыя паляпшаецца. Павялічыліся нараджальнасць і на 3,5 года — працягласць жыцця. На Віцебшчыне людзі жывуць у сярэднім 72,9 года...

За пяцігодку здалі пад ключ амаль што 2 мільёны квадратных метраў жылля. Справілі наваселле прыблізна 20 тысяч чалавек. Не дапушчана і сур'ёзнага росту ўзроўню беспрацоўя. Стварылі больш за 9,7 тысячы новых працоўных месцаў. Распавядаючы пра стан эканомікі, губернатар прааналізаваў і недахопы.

Прыярытэты чарговай пяцігодкі відавочныя — стварэнне новых працоўных месцаў, рост і дыверсіфікацыя экспарту тавараў і паслуг, прыцягненне інвестыцый...

І надалей будзе падтрымлівацца прадпрымальніцкая ініцыятыва. Сёння на Віцебшчыне больш за 9 тысяч суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу, прыкладна 23 тысячы ІП. У агульным аб'ёме падатковых паступленняў у казну ўклад прадпрымальнікаў — 22%. Дзелавымі людзьмі ствараюцца новыя працоўныя месцы, арганізуецца вытворчасць тавараў на экспарт.

Дэлегаты падчас выступленняў таксама шчыра падзяліліся тым, што хвалюе, акцэнтавалі ўвагу на рэзервах, патэнцыяле развіцця. Падкрэслівалася, што гэта магчыма ва ўмовах палітычнай стабільнасці, спакою ў грамадстве.

Дабрабыт народа, упэўненасць грамадзян у заўтрашнім дні — найвышэйшая мэта дзяржавы. Гэта думка агучвалася ўдзельнікамі абласнога сходу. Дэлегаты паабяцалі спрыяць на сваіх працоўных месцах таму, каб усё запланаванае рэалізавалася.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

# СУСТРЭНЕМСЯ НА МІНШЧЫНЕ!

**Наступны тыдзень прынясе мноства прыемных сустрэч. У гэтым можна не сумнявацца. Звяздоўцы не спыняюць свае падарожжы да падпісчыкаў нашай газеты. Гэтая смідзёнка была надзвычай насычанай, наступная чакаецца не менш цікавай.**

Ужо ў аўторак мы накіроўваемся на сустрэчы з нашымі чытачамі. Гэтым разам завітаем у цэнтральны рэгіён краіны — на Міншчыну. Прычым адразу ў некалькі раёнаў. У межах абласнога Дня падпісчыка мы накіроўваемся ў Нясвіжскі, Уздзенскі і Вілейскі раёны. Такім чынам, 21 чэрвеня Дзень падпісчыка газеты «Звязда» з 10 да 13 гадзін пройдзе на Нясвіжскім і Уздзенскім раённых вузлах паштовай сувязі (РВПС), а з 11 да 14 гадзін — на Вілейскім РВПС. Абавязкова прыходзьце!

Дарэчы, і ва ўсіх астатніх рэгіёнах Беларусі можна (і трэба!) аформіць падпіску на любімую «Звязду», калі вы такога не зрабілі дагэтуль. Заходзьце на наш партал zviazda.by у раздзел «Падпіска» — там усё літаральна «па палічках» раскладзена, якім чынам можна падпісацца. Дарэчы, ёсць шмат варыянтаў: у аддзяленнях сувязі «Белпошты», у кіёсках «Белсаюздруку», праз аўтаматызаваную сістэму АРІП. Можна падпісацца і праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» — на нашым партале выкладзена падрабязная (пакрокавая) інструкцыя, якім чынам гэта зрабіць.

Да завяршэння падпіскі засталіся лічаныя дні — не забудзьцеся падпісацца, каб 1 ліпеня атрымаць чарговы нумар «Звязды» — дарэчы, з праграмай тэлебачання. А пасля 9 жніўня разам сустрэць 99-гадовае найстарэйшай беларускай газеты!


■ Тры пытанні да ўлады

## Дзмітрый ВАСІЛЕЎСКІ:

# «У рабоце, як у музыцы, калі наладзіш усе інструменты, прыемна слухаць»

**У сельскай гаспадарцы гарачая пара: аграрыі спяшаюцца нарыхтаваць як мага больш зялёных кармоў. Дрыбінскі раён, як і большасць у Магілёўскай вобласці, лічыцца сельскагаспадарчым, і заспець яго кіраўніка ў кабінеце сёння не проста. Трэба кантраляваць абстаноўку на месцах. Таму размова са старшынёй райвыканкама вялася, як той казаў, на бягу. Дзмітрый Васілеўскі на пасадзе старшыні ўсяго чацвёрты месяц, да гэтага ён узначальваў сельскагаспадарчае прадпрыемства «Эксперыментальная база «Спартак» у аграгарадку Фашчаўка Шклоўскага раёна. Так што сельскагаспадарчая тэма для яго, лічы, родная.**



***— Леташні год быў цяжкім для сельскай гаспадаркі, адчуваўся недахоп кармоў. Што робіцца ў раёне, каб сітуацыя не паўтаралася?***

— На нарыхтоўцы травы і сіласу ў нас працуе 6 атрадаў. Дзве гаспадаркі СВК «Даманы» і СВК «Мір» для большай эфектыўнасці аб'яднаны ў адзін атрад. Спачатку ў «Даманах» заклалі каля 2 тысяч тон сенажу, потым пераехалі касіць у «Мір». Наогул стаіць задача нарыхтаваць на зімне-стойлавы перыяд на кожную ўмоўную галаву буйной рагатай жывёлы 26 цэнтнераў кармавых адзінак. Гэта 4 тысячы тон сена, 67 тысяч тон сенажу, 55 тысяч тон сіласу. Тэхніка за апошнія некалькі гадоў не абнаўлялася, мае свой фізічны знос, сваю амартызацыю, але ўся падрамантавана, на ёй працуюць вопытныя механізатары. Наша мэта максімальна напоўніць сянажныя траншэі і нарыхтаваць сена па новай тэхналогіі — у палімерную плёнку.

Паставілі сабе ўмовы за два тыдні гэтыя работы выканаць, працоўны дзень у нас зараз з 6 раніцы да 21.00. Прыцягваем тэхніку з прадпрыемстваў раёна.

Кантроль за ходам работ вядуць як спецыялісты сельгаспрадпрыемстваў, так і актыў раёна. Ёсць мабільныя групы з адказных работнікаў райвыканкама, якія вядуць нагляд нават ноччу. Маніторынг з боку абласных улад вельмі сур'ёзны, на дзень па дзве-тры камісіі прыязджае і правярае корманарыхтоўку: што косяць, якое драбленне, якая трамбоўка, якая тэмпература, якая вільготнасць. Прычым не толькі кантралююць, але і дапамагаюць. Напрыклад, група спецыялістаў на чале з першым намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама Алегам Чыкідам працавала на ўгоддзях «Трылесіна-агра». Нарыхтавалі каля 207 тон і склалі ў вялікія сцірты.

***— Травы скончацца, а што потым?***

— Цяпер мы ўбіраем шматгадовыя травы на раллі і лугавых угоддзях. Потым пойдзе ўборка аднагадовых азімых культур, яравых. Наступны этап — уборка рапсу, збожжавых і зернебабовых, падрыхтоўка да сяўбы азімых і іх сяўба, уборка кукурузы. Адначасова рыхтуем жывёлагадоўчыя аб'екты да зімоўкі. За перыяд з 20 ліпеня па 30 верасня ўсе работы павінны быць выкананы. Застанецца толькі пад'ём зябліва. Каб усоды паспець, праца павінна выконвацца ў рытме: раніцай паветра ўдыхнуў, а вечарам выдыхнуў.

Чалавеку прыемна, калі ён бачыць вынікі сваёй працы. Хочацца, каб у раёне не існавалі вялікія пляцоўкі для работы, з'явілася больш працоўных месцаў. Трэба прыдумваць нейкі інавацыйны прадукт. Некаторым кіраўнікам у раёне не хапае агню ў вачах. Трэба на метр падняцца на зямлёй, убачыць праблемы і вырашаць іх. Кожны кіраўнік павінен у душы быць бізнесменам. Незалежна ад таго, дзе ён працуе — у сельскай гаспадарцы, вытворчасці ці яшчэ дзе-небудзь. Павінна быць камерцыйная жылка, адчуванне моманту.

А яшчэ не трэба паказчыкі вытворчай дзейнасці раздзяляць з навядзеннем парадку. Нашмат больш прыемна адчуваць сябе там, дзе і трава скошана, і гною не відаць, і старыя падмуркі з-пад зямлі не выглядваюць... Добра, калі гэта разумее і кіраўнік гаспадаркі. Мы павінны быць як адна каманда. Гэта, як у музыцы: калі наладзіш усе інструменты, прыемна слухаць.

***— Дзмітрый Уладзіміравіч, як дэлегат V Усебеларускага народнага сходу, якія перспектывы вы бачыце ў развіцці вашага раёна?***

— У мінулай пяцігодцы Дрыбінскі раён зрабіў першыя крокі ў выкарыстанні свайго экспартнага патэнцыялу. У 2015 годзе экспарт склаў 1 мільён долараў, а экспарт паслуг — 17 тысяч долараў. Сёння перад усімі суб'ектамі гаспадарання пастаўлена задача рабіць усё для паляпшэння гэтых вынікаў.

Вялікія спадзяванні ўскладаюцца на прыватны бізнес. На 1 красавіка ў раёне налічвалася 88 камерцыйных арганізацый і 145 індывідуальных прадпрымальнікаў. Суб'ектамі прадпрымальніцтва раёна фарміруецца ўжо больш за 20% паступленняў у бюджэт. У чарговай пяцігодцы будзе працягнутая праца па развіцці прыватнага бізнесу і прыцягненні інвестыцый у раён, у тым ліку і прамых замежных. Для гэтага маецца 11 інвестыцыйных пляцовак, размешчаных паблізу аграгарадкоў, тры з іх створаны сёлета. На сайтах дзяржорганаў размешчана інфармацыя аб існуючай сельгарынай базе, аб'ектах нерухомасці, якія чакаюць сваіх інвестараў.

Сёння на тэрыторыі раёна паспяхова рэалізуюцца два інвестпраекты па альтэрнатыўнай энергетыцы. Аб'ём інвестыцый толькі па адным з іх склаў 63 мільярды рублёў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## УКРАІНА ПЕРШАЙ СЫШЛА З ДЫСТАНЦЫІ



Зборная нашых суседзяў стала першай краінай, якая страціла шанцы на выхад у плэй-оф. Даволі моцную і тэхнічную каманду "адчапілі" безвыніковай нічыёй немцы і палякі. А крыху раней украінцы нічога не змаглі зрабіць з брытанскай упартасцю каманды Паўночнай Ірландыі. Іншых кандыдатаў на вылет было шмат, але менавіта Украіна першай пакідае Еўра-2016, прычым ужо пасля другога круга, не забіўшы сапернікам ніводнага гола. Ну, а зборная Паўночнай Ірландыі святкавала сваю першую ў гісторыі чэмпіянатаў Еўропы перамогу.

## СЭРЦА НЕ ВЫТРЫМАЛА

У час вышэйзгаданага матча адбыўся трагічны выпадак — пасля першага гола футбалістаў Паўночнай Ірландыі прама на стадыёне Ліёна памёр 64-гадовы балельшчык гэтай каманды. Яму стала дрэнна, а ўрачы канстатавалі смерць ад сардэчнага прыступу. У чарговы раз на буйных спаборніцтвах адбылося такі выпадак, прычым не трагічнай можа стаць не дрэнная гульня ці вынік сваёй зборнай, а станоўчая падзея.

## ГРЭНАДЗЁРЫ ЕЎРА-2016

Звычайна самыя высокія спартсмены ў гульнявых відах спорту — гэта баскетбалісты і валейбалісты. Але і сярод футбалістаў хапае фактурных гульцоў, прычым не галкіпераў. Сайт championat.com вылучыў дзясятку веліканаў у полі сёлетняга Еўра, якую мы вам і прапануем.

Па 194 сантыметры росту маюць абаронцы англічанін Крыс Смолінг і немец



Джонатан Та, паўабаронца бельгіец Маруан Феллаіні, нападаючы італьянец Грацыяна Пеле і польскі абаронца Барташ Саламон. Адыёзны швед Златан Ібрагімавіч *(на фота)*, які ўжо цяпер лічыць сябе легендай футбола, мае ў актыве 195 сантыметраў разам з коскай. На 196 «вымахалі» нападаючы Марк Янка з каманды Аўстрыі, Арцём Дзюба са зборнай Расіі і ўкраінец Філіп Будкоўскі. Ну і лідарам па вертыкальных «габарытах» на Еўра-2016 стаў украінскі абаронца Яўген Хачарыдзі — яго рост складае 198 сантыметраў.

## ЗДЫМАЎ СТРЭС?

Нападаючы зборнай Румыніі Дэніс Алібек вызначыўся тым, што... курыў у раздзявальні перад сваёй заменай у матчы з французамі! Памочнікі не знайшлі форварда на лаўцы запасных, калі трэнер загадаў ім рыхтаваць яго на замену, а заспелі яго ў раздзявальні за курэннем. Нягледзячы на гэта, футбаліста выпусцілі на поле. Цікава, гэта Алібек так стрэс здымаў, ці з'яўляецца даўнім парушальнікам спартыўнага рэжыму?

**Іван КУПАРВАС.**